## ПАСЯДЖЭННЕ ПЕРШАЕ

*Вячэрняе, 14 студзеня 1935 года*

Старшыня—тав. **А. Г. Чэрвякоў**

**Чэрвякоў.** Згодна даным часовай Мандатнай Камісіі, на XI Усебеларускі З'езд Советаў прыбыла ад усіх гарадоў і раёнаў Совецкай Беларусі 759 дэлегатаў з рашаючым голасам і 96 дэлегатаў з дарадчым голасам. Дэлегаты выбіраліся на раённых з'ездах советаў і пленумах гарсоветаў з ліку ўдарнікаў—знатных людзей фабрык, заводаў, калгасаў, соўгасаў, МТС, навуковых і навучальных устаноў, чырвонаармейскіх частак і г. д. Данае прадстаўніцтва на Усебеларускі З'езд Советаў цалкам адпавядае Канстытуцыі БССР і СССР.

На падставе гэтага абвяшчаю XI Усебеларускі З'езд Советаў адчыненым.

Таварышы! У час адчынення XI Усебеларускага З'езда Советаў наша першая думка, наша першае слова накіроўваецца да светлай памяці Сяргея Міронавіча **Кірава,** загінуўшага ад зладзейскай рукі трыжды праклятага паследыша троцкісцка-зіноўеўскай антысовецкай групы, падасланага ворагамі рабочага класа і соцыялістычнага будаўніцтва.

У асобе Сяргея Міронавіча **Кірава** наша комуністычная партыя і вялікая соцыялістычная бацькаўшчына страцілі аднаго з выдатнейшых барацьбітоў за справу соцыялізма, стальнога большэвіка, пламеннага трыбуна рэволюцыі, несакрушымага барацьбіта, вернага друга і саратніка правадыра нашай партыі і сусветнага пролетарыята—тав. **Сталіна.**

Страта Сяргея Міронавіча **Кірава** асабліва востра адчуваецца працоўнымі масамі Совецкай Беларусі, бо працоўныя Совецкай Беларусі звязваюць пачатак свайго мірнага будаўніцтва з імем тав. **Кірава,** які з'яўляўся членам совецкай дэлегацыі па заключэнню мірнага дагавора з белапанскай Польшчай у 1920 г.

Няма слоў для таго, каб выказаць усю сілу гнева і жалю, узняўшыхся сярод працоўных Совецкай Беларусі пры першай-жа вестцы аб зладзейскім забойстве тав. Кірава.

Фашысты з Ленінградскага цэнтра, подлыя перабежчыкі ў лагер капіталізма, гатовыя дапамагаць самым лютым ворагам

Совецкага Саюза, марыўшыя аб інтэрвенцыі, думалі, шляхам зладзейскага забойства кіраўнікоў партыі і ўрада, дэзарганізаваць партыю, дэзарганізаваць кіраўніцтва совецкага ўрада. Аднак, няма той сілы ў свеце, якая магла-б перашкодзіць працоўным Совецкага Саюза закончыць пабудову социялізма. Мы бязлітасна знішчым контррэволюцыйную фашысцкую гадзіну, мы з корнем выкарчуем усе контррэволюцыйныя падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай і антысовецкай групы, мы яшчэ больш узмоцнім класавую палітычную пільнасць, каб падыхаючая контррэволюцыйная змяя не магла больш укусіць партыю. Мы увекавечым светлую памяць Сяргея Міронавіча **Кірава** яшчэ большым уздымам социялістычнага будаўніцтва, яшчэ большым узняццём класавай пільнасці, яшчэ шчыльнейшым аб'яднаннем сваіх радоў пад сцягам вялікай партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага правадыра партыі і рабочага класа і працоўных усяго света тав. **Сталіна**.

Схілім на хвіліну нашы баявыя сцягі Рэволюцыі для ўшанавання светлай памяці тав. **Кірава**. (*Усе ўстаюць*).

Таварышы! XI Усебеларускі З'езд советаў пачынае сваю работу напярэдадні XV гадавіны вызвалення Совецкай Беларусі ад белапольскай акупацыі і завяршае пасля X З'езда советаў чатыры гады ўпартай барацьбы за справу социялізма.

У выніку гераічнай барацьбы советаў, рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных, Совецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, прыйшла да XI Усебеларускага З'езда советаў і сустракае сваю XV гадавіну вызвалення з велізарнымі поспехамі на ўсіх франтах социялістычнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Асабліва вялікі поспех социялістычнага будаўніцтва Совецкай Беларусі за апошнія пяць год у сувязі з пераможным завяршэннем першай пяцігодкі ў чатыры гады і паспяховым выкананнем задач другога года другой пяцігодкі.

Гэтыя поспехі так вялікі, што карэнным чынамператварылі твар Совецкай Беларусі.

Раней Беларусь мела дробную поўсаматужную і саматужную прамысловасць, якая займала нязначнае месца ў народнай гаспадарцы.

Зараз у Совецкай Беларусі пабудаваны буйныя, абсталяваныя па апошняму слову тэхнікі, фабрыкі і заводы, на якіх налічваюцца сотні і тысячы рабочых. Прадукцыя прамысловасці складае звыш 60 проц. прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Яшчэ больш узнялася роля рабочых у гаспадарчым і палітычным жыцці нашай краіны, як класа—гегемона, як кіруючага класа ў барацьбе за социялізм.

Совецкая Беларусь стала краінай індустрыяльна-аграрнай.

Сялянская сельская гаспадарка Беларусі складалася раней з соцень тысяч раздробленых сялянскіх гаспадарак, з вялікім процантам сталыпінскіх хутароў, з беспрасветным жыццём для

мільёнаў і спрыяючай глебай для эксплаатацыі і набывання багаццяў памешчыкамі, растаўшчыкамі—крывасосамі і кулакамі.

Зусім па новаму пабудавалася наша вёска. У выніку велізарных поспехаў індустрыялізацыі Саюза ССР і БССР, у выніку велізарнай дапамогі з боку пролетарыята бядняцка-серадняцкім сялянскім гаспадаркам, тэхнічнага ўзброення сельскай гаспадаркі праз будаўніцтва МТС, у выніку бязлітаснай барацьбы супроць правых ухілістаў і трацкісцка-зіноўеўскай антыпартыйнай апазіцыі, бязлітаснага разгрома беларускіх нацыянал-дэмакратаў і ліквідацыі кулацтва, як класа, на аснове суцэльнай калектывізацыі, сельская аднаасобная бядняцка-серадняцкая гаспадарка Совецкай Беларусі перабудавалася ў гаспадарку буйных соўгасаў і калгасаў.

Звыш 70% бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Беларусі ўступілі ў калгасы. Селянін-аднаасобнікператварыўся ў калгасніка. Калгаснік стаў асновай і надзейнай апорай Совецкай улады ў вёсцы. Калгасы Совецкай Беларусі становяцца большэвіцкімі, а калгаснікі заможнымі. Разам з працоўным сялянствам Совецкага Саюза, сялянства Совецкай Беларусі цвёрда стала пад чырвоны штандар соцыялізма.

Раней Беларусь з'яўлялася сумным прыкладам непісьменнасці, некультурнасці, панавання самых бязглуздых забабон, асабліва ў вёсцы, якія свядома падтрымліваліся пануючымі класамі для таго, каб захаваць сваё панаванне і апраўдаць сваю лютую эксплаатацыю.

Так было раней. У сучасны момант Совецкая Беларусь ператварылася ў краіну суцэльнай пісьменнасці, усеагульнага абавязковага навучання дзяцей школьнага ўзроста на роднай мове. У Беларусі шырока развіта сярэдняя, тэхнічная і вышэйшая асвета, мае месца вялікі ўздым мастацтва, літаратуры, навукі, газетнай справы, пышна квітнее і развіваецца будаўніцтва культуры—нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Поспехі Совецкай Беларусі ў справе соцыяльна-культурнага будаўніцтва з'яўляюцца гонарам не толькі Совецкай Беларусі, але і ўсяго Саюза ССР.

Гарады Совецкай Беларусі ператвараюцца ў сапраўдныя цэнтры палітычнага дзяржаўнага жыцця, соцыялістычнай прамысловасці і культуры. Стары горад з яго рабочымі кварталамі на акраінах, дзе звычайна жылі бяднейшыя людзі ў гразі і нядолі, праклінаючы сваю долю, перабудоўваюцца па новаму. Для рабочых пабудаваны і будуюцца новыя, добра абсталяваныя, дамы, расце сетка клубаў, кіно, тэатраў, ідзе палепшанне камунальнай гаспадаркі. Гэта можна бачыць на прыкладзе Менска, Віцебска, Гомеля і інш. гарадоў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы